Астрынская гарпасялковая бібліятэка

# Помнікі Астрыны

2022 г.

Без каранёў няма жыцця, без гісторыі няма будучыні. Каб стаць патрыётам мала адной любові да радзімы, мала стаяць на мітынгу, мала любавацца акружаючым асяроддзем. Трэба імкнуцца быць чалавекам дасведчаным, зацікаўленым сваёй гісторыяй.

З чаго пачаць наш аповяд? Як цікава і дакладна расказаць пра нашу мясцовасць? Каго назваць славутымі людзьмі? Як падкрэсліць адметнае і не прапусціць дробязей?

У кожнага з нас ёсць куточак**,** дзе ён нарадзіўся, дзе прайшло яго маленства. Маленькая Радзіма. Менавіта сюды імкнецца чалавек. І для мяне гэта месца - наш пасёлак Астрына. У пасёлка вельмі цікавая гісторыя ва ўсе часы.

Гісторыя **касцёла** ў Астрыне пачалася ў 1667г., калі канцлер вялікі літоўскі Кшыштаф Зігмунт і Клара Ізабэла Пацы заснавалі ў Астрыне касцёл. Але есць спрэчная інфармацыя на гэты конт. Калі б ен сапраўды існаваў, то трапіў бы у дадзеныя інспекцыі 1674-1676гг. ці 1744г. Але нават на ўзроўні паданняў пра Астрынскі касцёл нічога не вядома. Магчыма гэта рашэнне ніколі не было выканана. Н Роўба лічыць, што гаворка ў дакументах



польскіх аўтараў 19ст. ішла пра рэстаўрацыю старадаўняй астрынскай царквы, якая ў той час была ўніяцкай. а не будаўніцтва касцела.

Калі зноў паўстала пытанне аб пабудове касцёла ў Астрыне, католікі звярнуліся з просьбай перанесці будынак старога (1674г. ) касцела з Дэмбрава ў Астрыну. А новы (1870г.) касцёл пакінуць Дэмбраву. Дазвол быў атрыманы. Праца была пачата ў 1929г., скончана ў 1930г. 12 верасня 1930г. касцёл быў асвечаны, а 17 лістапада ён згарэў. Прычына пажару не была высветлена. А ў 1933-1936гг. быў збудаваны новы касцел.



Працаваў Астрынскі касцёл да

1947г

Вясной 1994г. было распачата будаўніцтва касцёла. 12 кастрычніка 1996г. касцел быў асвечаны. З гэтага дня касцел святой Тэрэзы ў Астрыне стаў працаваць. (на здымку вышэй).



У 1556г упамінаецца астрынская **праваслаўная царква святога Спаса**, якая была драўлянай. Яе “фундатарамі” былі цівун Шымко Мацковіч і землеўладальнікі Зіневічы. У 1855г. у Астрыне пабудавана новая Спаса–Прэабражэнская царква з бутавага каменю і цэглы, абнесеная бутавай агароджай. 24 ліпеня 1865г. у прысутнасці амаль 7 тысяч чалавек адбылося ўрачыстае адкрыцце мураванай царквы ў цэнтры Астрыны, на рыначнай плошчы (стары будынак месціўся на ўскрайку мястэчка).

А як жа выглядаў новы храм у Астрыне?

Мела царква крыжовую аснову. Алтарная частка паўкруглая, астатнія аб’емы прамавугольныя. Храм накрыты двухскатнымі дахамі. Пасярэдзіне крыжа перакрыта васьмігранным купалам з галоўкай. Упрыгожаны храм пілястрамі і цікавымі вокнамі.

З’яўляецца помнікам архітэктуры рэтраспектыўна- рускага стылю з элементамі класіцызму.



Есць у Астрыне захаванні ваенннага перыяду.



У цэнтры пасёлка стаіць помнік 21 воіну 5 гвардзейскай кавалерыйскай дывізіі імя Катоўскага 3-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса, якія загінулі ў ліпені 1944г. пры вызваленні пасёлка ад фашысцка-нямецкіх захопнікаў і 17 партызанам, якія загінулі ў 1941-44гг і пры вызваленні Астрыны. Сярод пахаваных-камандзір атрада імя Ленінскага камсамола Д. Т.Панкоў, камандзір брыгады імя Ленінскага камсамола А.В.Станкевіч. У 1967г. на магіле пастаўлены помнік-скульптура воіна.

На тэрыторыі Астрыны есць яшчэ магіла падпольшчыкаў. У брацкай магіле пахаваны падпольшчыкі В.Вашкевіч, П.Жукоўскі, М.Карсунаў, В.Сакута, М.Слатвінскі, якія загінулі ў 1941-44гг. у барацьбе супраць гітлераўцаў. У 1950г. на магіле быў пастаўлены абеліск.







Абеліск двойчы абнаўляўся, апошні раз – вясной 2019 года.

Ахоўваецца дзяржавай. Так помнік выглядаў раней, а на фотаздымку вышэй паказана, як помнік выглядае цяпер.



На новых праваслаўных могілках знаходзіцца магіла невядомых салдат. Больш за 15 год год назад пошукавым клубам “Сокал” былі праведзены раскопкі на месцы баеў у раене Астрыны. Былі знойдзены астанкі вялікало колькасці салдат. Было арганізавана перазахаванне астанкаў. На гэтым месцы стаіць помнік.

На старых праваслаўных могілках у Астрыне знаходзіцца магіла Іванова Аляксея Іванавіча. Ён быў камандзірам першага партызанскага атрада на тэрыторыі Астрынскага сельсавета.

Там жа пахаваны былы камісар партызанскага атрада і работнік Васілішкаўскага райкама партыі пасля вызвалення Астрыны Міхалёў М.В. Ён быў забіты ў 1948 годдзе “зялёнымі братамі”. Так называліся салдаты Арміі Краёвай, якія хаваліся ў лясах пасля вайны. Яго помнік таксама быў абноўлены і даглядаюць яго вучні астрынскай сярэдняй школы і бібліятэкары.






На жаль, не захавалася ніводнага садова-паркавага комплекса ці сядзібы ў ваколіцах паселка.Гэта ў асноўным тлумачыцца тым, што Астрына з’яўлялася дзяржаўным уладаннем. Але ад гэтага яна не выглядае бедным.

Пры ўдалай арганізацыі можна правесці цікавую экскурсію, не выходзячы нават за межы цэнтра населенага пункта. А яшчэ можна расказаць аб цікавых будынках пасёлка.



Будынак былой школы, пабудаваны ў 1911 годдзе. Цяпер ён выглядае не вельмі добра, але будынак цікавы і з цікавай гісторыяй.





Гедаліях Баруховіч, альбо Гедалька, як па просту называлі яго ў мястэчку – гандаль і нарыхтоўка зерня, ювелірныя магазіны ў Варшаве, Кракаве. У двары свайго дома (**на здымку**), знаходзячыся ў гета, ён закапаў каштоўнасці. У савецкі час у доме размесціўся інтэрнат сельскага прафесійна-тэхнічнага вучылішча кінамеханікаў. У першай палове 70 -х гадоў хлопцы вырашылі зрабіць валейбольную пляцоўку і адкапалі хованку. Пра гэты клад паданні жывуць у пасёлку і сёння.





У Астрыне захаваліся будынкі дзвюх сінагог.Па меркаванні навукоўцаў, такіх сінагог, ды яшчэ ў такім добрым стане, захавалася ў Беларусі адзінкі. Вялікая і малая сінагога знаходзяцца побач. У будынках захаваліся адметныя рысы сінагог: ніша ў сцяне для захоўвання кніг, балкон і інш. Захавалася таксама некалькі яўрэйскіх дамоў, якія і цяпер служаць жыхарам пасёлка. Цікавая і трагічная гісторыя астрынскага гета і яўрэйскіх могілак.

Мне здаецца, што я змог зацікавіць гісторыяй маёй малой радзімы. Расказаць хацелася б пра яе яшчэ больш, але ў пасёлку ёсць людздзі, якія зробяць гэта значна лепей. Наведайце маю малую радзіму, не пашкадуеце!